6期. – 71 –72页. = Моу, Юань. Исследование истории китайского фортепиано / Юань Моу // Журнал Института искусств Гуанси. – 2008. – № 6. – С. 71 – 72.

**Ляхновіч А.А.,** студэнт
Навуковы кіраўнік – Крывашэй Д.А.

## ПАЛІТЫКА ГЕНДЭРНАЙ РОЎНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ: АКТУАЛЬНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ПЕРАМЕН

Гендэрная праблематыка адносіцца да ліку тых навуковых аспектаў даследавання сацыяльнай рэальнасці, якія адчуваюць ―асцярожнае” стаўленне навуковай супольнасці. Гэта датычыцца не толькі навукоўцаў і грамадства Рэспублікі Беларусь, але і многіх іншых краін. Можна вылучыць некалькі прычын такога стаўлення, але галоўным з‘яўляецца не зусім яснае разуменне таго, што такое ―гендэр”, а адсюль і недастатковае разуменне сутнасці гендэрных даследаванняў. Звычайна праблемы гендэру не ўспрымаюцца, альбо суправаджаюцца негатыўным кантэкстам у краінах з традыцыйным тыпам культуры. Гэта адбываецца таму, што краіны з традыцыйным тыпам культуры кіруюцца патрыярхальнымі гендэрнымі традыцыямі, а гендэрная праблематыка ўспрымаецца большасцю як асабліва жаночая. Аднак, як нам уяўляецца, важна працягваць адукоўваць як навуковыя, так і ненавуковыя супольнасці ў пытаннях, якія раскрываюць сутнасць гендэрнага падыходу, асаблівасцяў гендэрных даследаванняў.

Ажыццяўленне ў Беларусі палітыкі гендэрнай роўнасці з‘яўляецца актуальнай задачай, таму што ў краіне распаўсюджаныя прамыя і ўскосныя формы гендэрнай дыскрымінацыі, якія большасцю насельніцтва і прадстаўнікоў улады не ўсведамляюцца. Беларуская дзяржава мае міжнародныя абавязацельствы, згодна з якімі яна вызначае дасягненне гендэрнай роўнасці як адзін са сваіх прыярытэтаў, і дэкларуе правядзенне палітыкі гендэрнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роўнасці, так як яна спрыяе раскрыццю патэнцыялу ўсіх людзей і ўстойліваму развіццю ўсяго грамадства.

У Беларусі ёсць прававая і нарматыўная база, у якой замацавана роўнасць палоў, але ў ёй не змяшчаецца механізмаў рэальнай абароны гэтых правоў пры іх парушэнні. Ня распрацаваны механізм судовай абароны ад гендэрнай дыскрымінацыі.

Сярод часткі актывістаў, якія пазіцыяніруюць сябе ў якасці гендэрных экспертаў і трэнераў, няма аднастайнасці ў разуменні і прыняцці гендэрнага падыходу. Аднак у прасоўванні гендэрнай роўнасці прынцыпова важным з‘яўляецца аднолькавае разуменне і агульнае бачанне з‘явы якая ўдзельнічае ў гэтым працэсе.

Розначытанне сэнсаў сутнасці праблемы, базавых паняццяў можа дэзарыентаваць удзельнікаў і ўдзельніц руху за гендэрную роўнасць, зрабіць яго randнанакіраваным і неэфектыўным. Скажонае разуменне і неадэкватная трансляцыя пасылу ў грамадства дыскрэдытуюць ідэю гендэрнай роўнасці ў цэлым.

У сучасным беларускім грамадска-палітычным і культурным полі кажуць пра гендэрную роўнасць пераважна з пазіцыі пола-ролевага падыходу і, перш за ўсё, аб выкананні прыродных функцый жанчынамі. Прыярытэтнымі для жаночага самавыяўлення з‘яўляюцца такія актыўнасці як рэпрадукцыя і дэманстрацыя сваёй сэксуальнасці. Мужчыны пры гэтым застаюцца за рамкамі гендэрнага аналізу.

Існуе супярэчнасць паміж дзяржавай гендэрнай і дэмаграфічнай палітыкай, паколькі няма глыбокага і адэкватнага разумення сутнасці гендэрнай палітыкі.

Калі разглядаць становішча гендэрных праблем у Рэспубліцы Беларусь, то можна ўбачыць, што на нацыянальным узроўні быў створаны дакумент, а іменна, Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 2017/02/17 № 149 ―Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендэрнай роўнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2017 – 2020 гады”. Ён з‘яўляецца пятым праграмным дакументам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адпаведна яму сярод пастаўленых задач ёсць такі пункт як ―Гендэрная адукацыя і асвета" што на наш погляд з‘яўляецца адным з асноўных крокаў для дасягнення гендэрнай роўнасці.

У чым жа заключаецца гендэрная адукацыя і асвета згодна з гэтым дакументам?

―У дапамогу педагагічным работнікам распрацаваны шэраг метадычных дапаможнікаў: ―Гендэрная і сямейнае выхаванне навучэнцаў", ―Фарміраванне культуры бяспечнай жыццядзейнасці", ―Гендэрнае выхаванне як падрыхтоўка юнакоў і дзяўчат да сямейнага жыцця" і іншыя. Матэрыялы па асновах гендэрных ведаў таксама ўведзеныя ў тэматыку курсаў павышэння кваліфікацыі дзяржаўных служачых, кіраўнікоў і спецыялістаў сістэмы адукацыі, сацыяльнай абароны, аховы здароўя, юрыспрудэнцыі і іншых сфер. Разам з тым дадзеная праца патрабуе ўдасканалення. Гендэрная адукацыя ў перспектыве павінна стаць неад‘емным кампанентам сістэмы ведаў." [2, с. 9]

Нацыянальным статыстычным камітэтам распрацавана сістэма статыстычных паказчыкаў гендэрнай статыстыкі, сфарміраваная на аснове набору гендэрных паказчыкаў Еўрапейскай эканамічнай камісіі Арганізацыі Аб‘яднаных Нацый з улікам нацыянальнай спецыфікі.

У рамках Нацыянальнага плана прадугледжваецца рэалізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне ўзроўню кампетэнтнасці спецыялістаў устаноў адукацыі па гендэрных пытаннях, правядзенне гендэрнай экспертызы навучальных дапаможнікаў. Інфармацыя аб гендэрнай роўнасці будзе ўключацца ў навучальныя дапаможнікі па вучэбных прадметах якія распрацоўваюцца.

Гэта мы высветлілі прааналізаваўшы тэкст дакументу. Аднак, на наш погляд, у прынятай праграме не хапае плану дзеянняў у сферы культуры. А менавіта культурных праектаў, рэалізацыю якіх бы узялі на сябе дзяржаўныя ўстановы. На цяперашні час рэалізацыяй праектаў, накіраваных на дасягненне гендэрнай роўнасці і ўвогуле праектамі ў галіне гендэру займаюцца пераважна прадстаўнікі грамадскіх аб‘яднанняў і грамадскага сектару. Міжнародныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праекты з іх больш рэдкія. Сярод арганізацый можна вылучыць такія як: Міжнароднае грамадскае аб‘яднанне ―Гендэрныя перспектывы”; грамадскае аб‘яднанне ―Радзіслава”; беларускі фемінісцкі антыдыскрымінацыйны праект пра гендар і сэксуальнасць ―MAKEOUT”; некамерцыйная культурна-асветніцкая ўстанова DOTYK; міжнародны цэнтр гендэрных ініцыятыў ―Адліга: жанчыны за поўнае грамадзянства” і інш.

Аналіз сучаснай гендэрнай палітыкі ў Беларусі дазваляе нам даць наступныя парады:

– арганізацыям культуры мэтазгодна прасоўваць у соцыуме лідэраў, здольных рабіць яркія публічныя выступы на тэлебачанні, радыё, у друкаваных выданнях, у інтэрнэце з папулярызацыяй ідэй і пераваг гендэрнай роўнасці, што забяспечыць распаўсюджванне і прыняцце гэтай ідэі шырокімі масамі насельніцтва. Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь неабходна прадугледзець такія мерапрыемствы і прызначыць адказных выканаўцаў у Нацыянальным плане па дасягненні гендэрнай роўнасці на 2016–2020 гады;

– неабходна правесці навуковыя даследаванні, якія дапамогуць выявіць эканамічныя і сацыяльныя выгады правядзення палітыкі гендэрнай роўнасці ў краіне;

– неабходна распрацаваць і прыняць стратэгічны дакумент, у якім будуць зафіксаваныя доўгатэрміновыя мэты і задачы гендэрнай палітыкі, апісана тэхналогія распрацоўкі і паэтапнай рэалізацыі гендэрнай палітыкі ва ўсіх сферах жыцця соцыума, улічана роля і адказнасць усіх суб‘ектаў гендэрнага сектара, вызначаны індыкатары для ажыццяўлення маніторынгу па дасягненню мэтаў і вырашэння задач;

– неабходна развіваць патэнцыял гендэрнага сектара як за кошт стварэння спрыяльных умоў дзейнасці асноўных зацікаўленых суб‘ектаў, а таксама мабілізаваць іх на ўласную актывізацыю і ўмацаванне.

Такія даследаванні неабходна суправаджаць шырокай асветніцкай працай для таго, каб кожны чалавек, незалежна ад полу, мог свядома ўплываць на магчымасць рэалізацыі сваёй сацыяльнай і індывідуальнай суб‘ектнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Lauretis, T. Technologies of Gender: Theories of Representation and Difference / T. Lauretis. – Indiana: University Press, 1987. – 149 c.

2. Национальный план действий по обеспечению гендерного равенства в Республике Беларусь на 2017 – 2020 годы: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 17 февр. 2017, № 149 // Национальный правовой Интернет–портал Республики Беларусь. – 24.02.2017. – 5/43382.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ляшкевіч А.У.,** студэнт
Навуковы кіраўнік – Раманенкава В.І.

**НАРОДНА-ПЕСЕННЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСІ: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ**

Народная культура – найважнейшая частка нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Народ заўсёды выступаў сапраўдным творцам і носьбітам самабытных этнакультурных традыцый, якія ён беражліва захоўваў і клапатліва развіваў, перадаючы як сакральны дар у спадчыну сваім нашчадкам.

Важным відам народнай творчасці з‘яўляецца народная музыка. Музычны фальклор – аснова нацыянальнага музычнага стылю, вызначальная крыніца прафесійнай кампазітарскай музыкі і канцэртнай творчасці прафесійных і самадзейных музычных калектываў. Носьбітамі беларускай народнай культуры з‘яўляліся і з‘яўляюцца народныя спевакі, народныя музыканты, народныя інструментальныя ансамблі. Вядучае месца ў беларускай музычнай культуры займае песенная творчасць, якая ахоплівае некалькі вялікіх гістарычных пластоў. Песенная творчасць беларусаў адметная разнастайнасцю і багаццем мясцовых традыцый. Традыцыі выяўляюцца і ў перавазе пэўных песенных жанраў у пэўных этнаграфічных зонах, і ў мясцовай стылявой